________________________________________
(miestas / rajonas, mokykla)

_____ klasės mokinio (-ės) ______________________________
(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

## РОДНАЯ МОВА (БЕЛАРУСКАЯ)

2018 m. mokyklinio brandos egzamino užduotis

Pagrindinė sesija

2018 m. birželio 12 d. Trukmė – 4 val. (240 min.)

**NURODYMAI**

- Pasitikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų arba kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Užrašykite savo vardą ir pavardę, miestą / rajoną, mokyklą ir klasę tam skirtoje užduoties sąsiuvinio vietoje.
- Rašykite aiškiai, įskaitomai juodai rašančiu tušinuku. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti, už ribų parašyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir du tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1–2 puslapiai) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **pažymėkite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausia rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas ir vertinamas.**

Linkime sėkmės!

**VERTINIMAS**

| **II dalis (teksto suvokimas)** | **III dalis (teksto kūrimas)** | **TAŠKŲ SUMA** |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ____________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

____________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

____________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2018 m.

# II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

*Прачытайце тэкст і выканайце змешчаныя пасля яго заданні.*

## ПРЫРОДА

I Мы ўсе прывыклі, што прырода, – чыстая, цнатлівая, шчодрая. І ўжо толькі адзін напамін пра яе заўсёды выклікае ў нас нейкае вельмі ж ужо цёплае, замілаванае, як ласка, пачуццё. Халоднай снежнай зімою, калі ад завірух не відно, дзе канчаецца зямля і пачынаецца неба, цёпла думалася пра зялёнае лета; мокрай, прастуджанай восенню, выхаджанай і вытаптанай наскрозь дажджлівымі вятрамі, хораша марылася пра сонечную вясну... І неяк не хацелася верыць, што можа быць яшчэ і іншая думка пра святыню твайго пакланення – раззлаваная, суровая, злосная.

II Маўляў, прырода – бязлітасны вораг чалавека. Яна часта, вельмі часта прымушае «цара прыроды» плакаць ад сваёй бездапаможнасці падчас пажараў, ураганаў, мяцеліц, буранаў, тайфунаў, землетрасенняў, вывяржэнняў, падчас нашэсця шкоднікаў, падчас чумы і голаду.

III Маўляў, прырода нарадзіла чалавека недасканалым стварэннем. Ён прыйшоў у свет голы і безабаронны, у яго не было нават тых інстынктаў, што ў звяроў, не было іхніх сродкаў абароны і нападзення – рагоў, капытоў,ваўчыных зубоў. Таму і не дзіўна, што чалавек тысячагоддзямі пакланяўся жывёлам, якія былі надзелены ўсім гэтым і таму здаваліся больш любімымі дзецьмі прыроды.

IV Маўляў, наваколле прывячае варожыя нам сілы: зямля перапоўнена злосцю, неба цёмнае ад лютасці, і таму чалавек прыйшоў да будаўніцтва вялікага горада – адзінага пэўнага месца, якое ўратуе яго ад бесчалавечнасці, ад бессардэчнасці прыроды...

V Гэтыя развражанні аб прыродзе належаць амерыканскаму сацыёлагу Эрыку Хоферу. Каго не ўразяць гэтыя словы, хто прачытае такую характарыстыку прыродзе! Але між іншым кожны, мусіць, адчуе, што тут ёсць добрая доля праўды, якую нам чамусьці ўжо дужа не хочацца ведаць.

VI Можа, таму, што гэта ўсё вельмі нечаканае, а можа, таму, што мала каму з чалавецтва даводзілася ўведаць тое акропнае пачуццё страху, калі чалавек астаецца сам-насам з джунглямі ці з ціхім белым бязмежжам ледавітай маўклівасці. І таму я спяшаюся ўпэўніць сябе, што прырода, абкачаная, як той камень, стагоддзямі і інстынктыўна перададзеная мне маімі продкамі, не можа быць бязлітаснай і варожай. Тым больш цяпер, калі з’явіўся новы від кентаўра – Чалавек-машына, які ўсё больш і больш засяляе зямлю і амаль кіруе чалавекам. Тым больш цяпер, калі мы, марачы купіць пад Новы год сапраўдную елку, купляем сінтэтычную, забыўшыся, што сапраўдная елка мае яшчэ пах і расце не на фабрыцы.

VII Прырода мне не можа быць ворагам. Яна ўсё ж чыстая, цнатлівая, шчодрая...

*Я. Сіпакоў*

## Заданні да тэксту

*Балы* *I* *II* *III*

**1.** Выпішыце сказ, у якім заключаецца галоўная думка тэксту.

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**2.** З **I** абзаца выпішыце **дзве** антанімічныя групы эпітэтаў з супрацьлеглай характарыстыкай прыроды.

Станоўчая: ______________________________________

Адмоўная: ______________________________________

*(3 балы)*

**3.** Сфармулюйце галоўную думку **IV** абзаца.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**4.** Запішыце **тры** аргументы, з дапамогай якіх Эрык Хофер даказвае, што прырода – вораг чалавека.

1. ____________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

2. ____________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

3. ____________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

*(3 балы)*

| Сума балаў за заданні 1–4 *(макс. 8 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы*
*I II III*

**5.** Паразважайце, чаму словы “цар прыроды” напісаны ў двукоссі.

*(2 балы)*

**6.** Выпішыце **два** сказы, якія ілюструюць супярэчлівасць поглядаў аўтара на прыроду.

*(2 балы)*

**7.** Абвергніце думку аб тым, што *прырода нарадзіла чалавека недасканалым стварэннем* (**III** абзац).

*(2 балы)*

**8.** Сфармулюйце свой адказ на пытанне *Якую елку выбраць: жывую ці штучную*?

*(2 балы)*

**9.** Чым з’яўляецца прырода для аўтара паэмы “Новая зямля” Я. Коласа?

*(2 балы)*

| Сума балаў за заданні 5–9 *(макс. 10 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы*
*I II III*

**10.** Аднавіце **чатыры** выказванні вядомых людзей (І. В. Гётэ, Р. Інгерсолла, Ф. Бэкана) пра прыроду, спалучаючы часткі фраз з левай і правай калонак.

| | |
|---|---|
| “У прыродзе няма ні ўзнагарод, ні пакаранняў, | Прырода не дарує ніколі”. |
| “Прырода ніколі не памыляецца; | Імкнецца да самазахавання”. |
| “Прыроду перамагаюць, | толькі наступствы”. |
| “Бог даруе, і людзі даруюць. | памылкі ... робяць толькі людзі”. |
| “Прырода скараецца толькі перад тым, | толькі падпарадкоўваючыся яе законам”. |

1. ______________________________________________
______________________________________________

2. ______________________________________________
______________________________________________

3. ______________________________________________
______________________________________________

4. ______________________________________________
______________________________________________

*(4 балы)* ___ ___ ___

**11.** Прывядзіце **два** уласныя аргументы на карысць таго, што прырода – вораг (альбо ***не*** вораг) чалавеку.

1. ______________________________________________
______________________________________________

2. ______________________________________________
______________________________________________

*(2 балы)* ___ ___ ___

**12.** Вызначце стыль і тып маўлення тэксту.

Стыль – ______________________________________

Тып маўлення – _______________________________

*(1 бал)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 10–12 *(макс. 7 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы*

| | I | II | III |
|---|---|---|---|

**13.** Назавіце **тры** асаблівасці гэтага стылю.

1. ________________________________________
2. ________________________________________
3. ________________________________________

*(3 балы)* __ __ __

**14.** Назавіце чатыры жанры гэтага стылю.

________________________________________

________________________________________

*(2 балы)* __ __ __

| Сума балаў за заданні 13–14 *(макс. 5 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

**ЧАРНАВІК**

**ЧАРНАВІК**

АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА

| | **Макс. сума** | **Члены камісіі** | | |
|---|---|---|---|---|
| | | **I** | **II** | **III** |
| Сума балаў за заданні 1–4 | 8 | | | |
| Сума балаў за заданні 5–9 | 10 | | | |
| Сума балаў за заданні 10–12 | 7 | | | |
| Сума балаў за заданні 13–14 | 5 | | | |
| **Сума балаў** | 30 | | | |
| **Акругленая сума балаў** | 30 | | | |

III egzamino dalis

## TEKSTO KŪRIMAS

*З прапанаваных трох тэм сачыненняў і двух тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу.*

*Ваша праца павінна быць аб'ёмам 250–400 слоў (1–2 старонкі фармата A4). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.*

### ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

**1.** "Тутэйшасць" – праблема грамадства ці спосаб жыцця? (Праблема "тутэйшасці" ў беларускай літаратуры).

**2.** "Паэзія – хвароба ўсіх вякоў.
Паэзія – служанка й каралева" (Р. Барадулін).

**3.** Ці можна паэму Я. Коласа "Новая зямля" назваць энцыклапедыяй беларускай прыроды?

### ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

**4.** Ірына Багдановіч *(нар. 30 красавіка 1956 года, беларуская паэтэса і літаратуразнавец)*

ЗАПАВЕТНАЕ

У садоўніка ў садзе ёсць кветка адна,
Што між іншымі лепшай здаецца.
Гэтай кветцы душу аддае ён да дна,
Паліваць яе першай імкнецца.
І за лёс яе клопат ён мае,
А яна, як і ўсе там, такая.

Калі можна з тым садам і свет параўнаць,
То з нас кожны ў ім мае куточак
Запаветны. І нельга яго адабраць,
Абясчэсціць ці зганьбіць аднойчы.
Бо не простая гэта краіна,
Бо завецца краіна – айчынай.

Сярод іншых не кінецца ў вочы яна,
Экзатычных пейзажаў няма ў ёй.
Колькі трэба, блакітнага ёсць палатна,
Колькі трэба – сінечы ільнянай.
Ёй лясныя сукенкі да твару,
У азёрных вачах яе – мары.

Дабрынёй маладой усміхаецца твар,
На дзяўчыну падобна з Палесся.
Ты, радзіма, усім надала хараства,
Хто з калыскі пачуў тваю песню.

У садоўніка кветка адзіная…
Чалавека ж няма без радзімы.

**5.** Паводле М. Стралъцова

Табе, шчодры сялянскі стол, хачу сказаць я ласкавае слова. Я памятаю кожную метку на тваіх дошках. Вось гэтыя шрамы ад вострага нажа засталіся з таго часу, калі дзед крышыў на ім табаку, а бабуля – капусту. Гэтыя кругленькія ямачкі – сляды моцных арэшкаў, якія нават малатком разбіць было цяжкавата. А вось гэтыя зарубкі на тваіх ножках расказваюць, як растуць, падымаюцца ўверх дзеці.

Ты прапах аўсяным кісялём, капустаю, блінамі, клёцкамі ды бульбай з грыбамі. Я веру, што ты ўсё яшчэ памятаеш цеплыню і пах загарэлых караваяў, якія тольш што вынялі з печы.

Стол, ты яшчэ не забыўся, як мой бацька пачынаў новы каравай? Ён доўга, старанна абціраў пот, потым браў круглы бохан леваю рукою, прыціскаў яго да грудзей, а праваю абганяў кругом ладны акраец. У сялян была спрадвеку вялікая павага і пашана да хлеба, які ім не так ужо легка даваўся.

Стол, ты памятаеш і галодныя дні нашы, калі ў хаце, здавалася, халадала ад бездапаможна парожняй печы. Ты ж ведаеш, як наша мама старалася хоць нечым скрасіць гэты час. Ёй было дастаткова аднаго зубка часнаку і малюсенькага кавалачку здору, каб у нашай хаце запахла, як на каляды. Патоўчанае ўсё гэта разам так здобрывала суп, што мы ніяк не маглі адарвацца ад міскі. І цяпер вось мы можам сабрацца ўсе ў госці, пасядзець за тым жа сталом, успомніць, як дружна мы жылі. Але ранейшае ўжо ніколі не зможа вярнуцца. І нічога не зробіш: птушкі, што вылецелі з аднаго гнязда, вярнуцца ўсе ў яго зноў не могуць. Ім трэба рабіць новыя гнёзды.

**ЧАРНАВІК**

*Працяг чарнавіка на 12-й старонцы*

## ЧЫСТАВІК

| I | II | III |
|---|---|---|
| | | |

*Працяг чыставіка на 13-й старонцы*

*Працяг чарнавіка*

*Працяг чарнавіка на 14-й старонцы*

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 15-й старонцы***

*Працяг чарнавіка*

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

| III частка (сачыненне) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| Змест | Структура тэксту | Стыль мовы | Граматнасць | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |